МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ

# ТЭХНАЛОГІЯ РЭСТАЎРАЦЫІ ТВОРАЎ ДПМ
# ( МАСТАЦКАЕ ТКАЦТВА )

Вучэбная праграма
для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасцях
1-15 02 01 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (па напрамках)
1-15 02 01-07 – дэкаратыўна-прыкладное мастацтва
(рэстаўрацыя твораў)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2012

Праграму распрацавала выкладчык кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Непачаловіч А.І.

Рэцэнзенты:

Сухаверхава Н.У., намеснік старшыні секцыі мастацкага тэкстыля ГА "Беларускі саюз мастакоў"

**Зацверджана**

Кафедрай народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 10 ад 12.05.2012 г.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Ручное ўзорнае ткацтва з'яўляецца найважнейшай галіной дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі і самабытнай мастацкай з'явай ў нацыянальнай культуры беларусаў. Гэта адзін з самых старажытных відаў мастацкай творчасці, які атрымаў надзвычай шырокае распаўсюджанне на тэрыторыі нашай краіны. На працягу шматлікіх стагоддзяў набываўся і передаваўся з пакалення ў пакаленне каштоўны вопыт па мастацкаму афармленню даматканых вырабаў, у тым ліку і розных частак адзення, развіваліся і ўдасканальваліся віды і тэхнікі ткацтва, адточвалася графіка арнаментальных матываў, складалія характэрныя кампазіцыйныя прыёмы. Перыяд найвышэйшага росквіту беларускага ўзорнага ткацтва прыпадае на канец XIX – пачатак XX ст. Тканыя вырабы гэтага перыяду (абрадавыя ручнікі, традыцыйны касцюм) з'яўляюцца сапраўднай візітнай карткай беларусаў. Яны адлюстроўваюць эстэтычны густ народа, асаблівасці гістарычнага, эканамічнага і культурнага развіцця краіны, узаемаадносіны з культурай іншых этнасаў.

Знаёмства з багатай спадчынай беларусаў у галіне ручнога ўзорнага ткацтва павінна спрыяць развіццю ў моладзі нацыянальнай самасвядомасці, пачуцця гонару за сваю бацькаўшчыну і яе таленавіты народ, імкненню зберагчы скарбы беларускага народнага мастацтва як яркую старонку нацыянальнай культуры. Практычнае авалоданне некаторымі традыцыйнымі прыёмамі мастацкага ткацтва дае падставы для абуджэння творчых здольнасцей, развіцця іх фантазіі і мастацкага густу.

Вывучэнне курса з'яўляецца важнай часткай прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці "рэстаўрацыя і кансервацыя твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва".

Асноўны змест курса накіраваны на авалоданне тэхнікай і тэхналогіяй апрацоўкі матэрыялаў, вывучэнне традыцыйных форм і відаў ДПМ, методык рэстаўрацыі, а таксама ўзбагачэнне іх новымі мастацка-вобразнымі, кампазіцыйнымі, тэхналагічнымі прыёмамі.

Курс "рэстаўрацыя і кансервацыя твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва" прадугледжвае:

-вывучэнне вытокаў і традыцый народнага мастацтва Беларусі;
-засваенне тэхнік і тэхналогій апрацоўкі матэрыяла;
-засваенне тэхналогій рэстаўрацыі і кансервацыі;
-выкананне эскізаў мастацка-вобразнага, пластычнага і кампазіцыйнага вырашэння;
- выкананне вучэбнай працы ў матэрыяле;
- самастойную працу студэнтаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Асноўнымі мэтамі* курса з'яўляюцца развіццё мастацкіх здольнасцяў студэнтаў, фарміраванне асобы мастака і яго нацыянальнай свядомасці праз далучэнне да традыцый народнага мастацтва.

*Задачы курса:*

- выву чэнне вытокаў і традыцый народнага мастацтва Беларусі

- засваенне тэхнік і тэхналогій апрацоўкі матэрыялаў

- засваенне тэхналогій рэстаўрацыі і кансервацыі
- выкананне эскізаў мастацка-вобразнага, пластычнага і кампазіцыйнага вырашэння
- выкананне вучэбнай працы ў матэрыяле
- самастойная праца студэнтаў.

- раскрыццё асаблівасцей традыцыйнай культуры Беларусі праз аналіз гісторыі рамяства;
- атрыманне ведаў па рэгіянальных асаблівасцях беларускага народнага ДПМ;
- развіццё мастацка-вобразнага мыслення;
- авалоданне выразнымі сродкамі дэкаратыўнай кампазіцыі, яе рытмічнай і каларыстычнай арганізацыі;
- засваенне тэхік і тэхналогій рэстаўрацыі і кансервацыі твораў ДПМ, авалоданне асноўнымі прыёмамі;
- фарміраванне практычных навыкаў і ўменняў, неабходных для стварэння і рэстаўрацыі мастацкіх твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва у галіне узорнага ткацтва.

Асноўны змест курса складаюць пытанні гісторыі развіцця мастацтва узорнага ткацтва Беларусі, традыцый народнай культуры, тэхнікі і тэхналогіі, а таксама практычныя навыкі выканання тканых вырабаў, якія разглядаюцца і вывучаюцца на працягу двух семестраў па спецыялізацыі "рэстаўрацыя і кансервацыя твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва".

Метадалагічную аснову курса складаюць авалоданне рознымі тэхнікамі і тэхналогіямі узорнага ткацтва, вывучэнне і захаванне яго традыцыйных прыёмаў.

У выніку вывучэння курса студэнт павінен *ведаць*:

- асаблівасці розных відаў ДПМ:
-спецыфіку кампазіцыйнага вырашэння твораў ДПМ;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- прыёмы стылізацыі;
-магчымасці функцыі колеру ў творах ДПМ.

*умець*:
- праяўляць здольнасці у прасторавым і вобразным мысленні;
- ствараць завершаную кампазіцыю з прымяненнем ведаў аб мастацка-стылістычных законах вырабу твораў ДПМ;
- улічваць пры распрацоўцы твораў дэкаратыўныя якасці, уласцівасці і тэхналагічныя асаблівасці матэрыялаў.

Для засваення курса выкарыстоўваюцца лекцыі, лабараторныя і самастойныя заняткі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН. ТЭХНАЛОГІЯ РЭСТАЎРАЦЫІ ТВОРАЎ ДПМ, РАЗДЗЕЛ УЗОРНАЕ ТКАЦТВА.

| Раздзелы і тэмы | Колькасць гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекцый | дробнагруп. | сам. раб. |
| **Раздзел І. Развіццё мастацтва ўзорнага ткацтва.** | | | | |
| Тэма 1. Уводзіны: з гісторыі ўзорнага ткацтва. | 6 | 2 | | 4 |
| Тэма 2. Абрадна-рэлігійныя функцыі тканых вырабаў | 6 | 2 | | 4 |
| Тэма 3.Абрадна-святочныя функцыі тканых вырабаў. | 6 | 2 | | 4 |
| Тэма 4. Традыцыйныя утылетарна-ўжытковыя вырабы ўзорнага ткацтва | 6 | 2 | | 4 |
| Тэма5. Развіццё ўзорнага ткацтва на тэрыторыі Беларусі у XX ст. | 6 | 2 | | 4 |
| **Раздзел ІІ. Тэхнікі і прыёмы ўзорнага ткацтва.** | | | | |
| Тэма 1. Тэхналогія апрацоўкі матэрыялу. | 20 | 2 | 8 | 10 |
| Тэма 2. Характарыстыка пластычных і фізічных якасцяў матэрыяла. Матэрыялы для рэстаўрацыі. | 30 | | 10 | 20 |
| Тэма 3. Асноўныя тэхнікі узорнага ткацтва. Стварэнне бытавых рэчаў і прынцыпы іх рэстаўрацыі. | 40 | | 20 | 20 |
| Тэма.4.Выраб чатырохрамізных тканін. | 12 | | 4 | 8 |
| Тэма 5. Выраб пераборных тканін. Рэканструкцыя як метад. | 30 | | 10 | 20 |
| Тэма 6. Выкарыстанне выбарнай тэхнікі ткацтва. | 50 | | 20 | 30 |
| **Раздзел ІІІ. Двухасноўныя, двухслойныя вырабы ткацтва.** | | | | |
| Тэма 1. Падвойнае ткацтва і яго пымяненне. | 14 | | 4 | 10 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Тэма 2. Прылады працы і тэхналагічныя асаблівасці падвойнай тэхнікі.. | 16 | | 6 | 10 |
| Тэма 3. Тэхніка і тэхналогія рэстаўрацыі падвойных тканых вырабаў. | 30 | | 10 | 20 |
| Тэма 4. Асноўныя прыёмы вырабу падвойных тканін. | 30 | | 10 | 20 |
| Усяго | 314 | 24 | 102 | 188 |

## ЗМЕСТ КУРСА

### Раздзел I. Развіццё мастацтва ўзорнага ткацтва.

**Тэма 1.** Уводзіны: з гісторыі ўзорнага ткацтва.

Гістарычнае развіццё народнага ткацтва Беларусі і плыў старадаўняга ткацтва на сучаснае. Асноўныя тэхнікі .

**Тэма 2.** Абрадна-рэлігійныя функцыі ўзорнага ткацтва.

Абрадна-рэлігійная сімволіка дзеяння (рытуала, абрада) і матэрыяла. Падзел саламяных вырабаў на бытавыя і культавыя. Прымяненне прадметаў ткацтва на крэсцьбінах, венчанні, адпеванні. Выкарыстанне абраднай тканай атрыбутыкі у рэлігіных святах. Развіццё тэхнік ткацтва з падзелам на бытавыя і абрадавыя.

**Тэма 3.** Абрадна-святочныя функцыі ўзорнага ткацтва. Культавыя тканыя вырабы і іх выкарыстанне у беларускіх абрадах календарных святаў.

**Тэма 4.** Традыцыйныя утылетарна-ўжытковыя вырабы ўзорнага ткацтва .

Асарыментны рад утылетарна-ўжытковых вырабаў ўзорнага ткацтва . Утылетарнае прымяненне тканых вырабай у дамашей гаспадарцы.

**Тэма 5.** Развіццё ўзорнага ткацтва на тэрыторыі Беларусі у ХХ ст. ХХ стагоддзя.

Узнаўленне і развіццё традыцыйнага ткацтва Беларусі у сярэдзіне ХХ века. Асаблівасці развіцця сучаснага беларускага ткацтва. Творчасць народных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

майстров ўзорнага ткацтва канца ХХ-пачатка ХХІ в.в.. Дзейнасць НДМЛ "Скарбніца" і Барысаўскага камбіната прыкладнога мастацтва імя А.М. Кішчанка. Аб'ёмна-прасторавыя тканыя кампазіцыі. Манументальны тэкстыль Беларусі.

## Раздзел ІІ. Тэхнікі і прыёмы ўзорнага ткацтва.

**Тэма 1.** Тэхналогія апрацоўкі матэрыялу.

Пдрыхтоўка абсталявання, прылад працы і матэрыялаў да вырабу вучэбных работ, у тым ліку: сноўка асновы, навіўка асновы, запраўка ткацкага стана. Асаблівасці работы на ткацкім абсталяванні.

Дапаможныя матэрыялы і прылады працы.

**Тэма 2.** Характарыстыка пластычных і фізічных якасцяў матэрыяла.

Пластычныя якасці баваўнянай, ільняной, шэрсцянай (і інш.) сыравіны.

**Тэма 3.** . Асноўныя тэхнікі узорнага ткацтва. Стварэнне бытавых рэчаў і прынцыпы іх рэстаўрацыі.

Асноўныя тэхнікі і прыёмы беларускага народнага ткацтва: палатняная, закладная, браная, рамізная, пераборная, выбарная, ажурная, падвойная двухасноўная. Выраб тканін рознага прызначэння.

**Тэма 4.** Выраб чатырохрамізных тканін.

Разнастайнасць магчымацей чатырохрамізнай тэхнікі і яе рэгіянальныя асаблівасці. Прыёмы стварэння ўзора у гэтай тэхніцы на ткацкім абсталяванні.

**Тэма 5.** Выраб пераборных тканін. Рэканструкцыя як метад.

Традыцыі пераборнага ткацтва і рэгіянальныя асаблівасці тэхнікі. Прыёмы стварэння ўзора у пераборнай тэхніцы на ткацкім абсталяванні.
Прынцыпы рэстаўрацыі. Рэканструкцыя.

**Тэма 6.** Выкарыстанне выбарнай тэхнікі ткацтва.

Традыцыі выбарнага ткацтва і яго рэгіянальныя асаблівасці. Прыёмы стварэння ўзора у выбарнай тэхніцы на ткацкім абсталяванні.

Распрацоўка эскіза і выкананне твора на аснове традыцыйных і новых тэхналогій.

## Раздзел ІІІ. . Двухасноўныя, двухслойныя вырабы ткацтва.

**Тэма 1.** Падвойнае ткацтва і яго прымяненне.

Традыцыйныя гродзенскія падвойныя дываны. Прыёмы стварэння ўзора у падвойнай тэхніцы на ткацкім абсталяванні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Распрацоўка эскіза і выкананне твора на аснове традыцыйных асаблівсцей двухасноўнай тэхнікі.

**Тэма 2.** Тэхніка і тэхналогія рэстаўрацыі падвойных тканых вырабаў.Прылады працы і асаблівасці тэхналагічныя асаблівасці аплікацыі саломкай.

Тэхніка і тэхналогія саламянай аплікацыі на розных паверхнях. Дапаможныя прылады працы і спосабы апрацоўкі саломы і падрыхтоўкі да работы.

**Тэма 3.** Тэхніка і тэхналогія.

Віды перапляцення саламянай стужкі. Тэхналогія геаметрычнай і крываліненйнай аплікацыі.

**Тэма 4.** Асноўныя прыёмы вырабу падвойных тканін.

Засваенне працы на ткацкім абсталяванні у падвойнай тэхніцы. Асноўныя прыёмы падвойнага ткацтва. Вобразнае вырашэнне твора дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Заданне 1.

Праца над эскізам твора дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва пад агульнай тэмай “Мастацкае ўвасабленне традыцый”

Заданне 2.

Выкананне ў матэрыяле у абранай студэнтам тэхнікі ткацтва па ўласным эскізе твора па тэме “Мастацкае ўвасабленне традыцый”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЛІТАРАТУРА ПА КУРСУ. АСНОЎНАЯ.

1. Арнаменты Падняпроўя. – Мінск: Беларуская навука, 2004.
2. Беларускі арнамент: Альбом. – М.,1979.
3. Буева, Ж. М. Художественное ткачество/ Ж.М. Буева – Гродно, 2007.
4. Винникова, М.Н. Возрождение ремесла / М.Н. Винникова, В.И. Селивончик. - Минск, 1993.
5. Гаврилов Д., Наговицын А. Боги славян. Язычество. Традиция. – М.: Рефл-Бук, 2002.
6. Иванов В.В., Топоров В.Н. Исследования в области славянских древностей. – М., 1974.
7. Иванов В.В., Топоров В.Н. Мокошь // Мифы народов мира. Энциклопедия. Т.II. – М., 1992.
8. Кацар М. С. Беларускі арнамент. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя, 1996.
9. Калашников В. Боги древних славян. – М.: Белый город, 2003.
10. Королёва Н. С., Кожевникова Л. А. Современное узорное ткачество. – М.: Лёгкая индустрия, 1970.
11. Курилович А. Н. Белорусское народное ткачество. – Минск: Наука и техника, 1981.
12. Лабачэўская В. А. Повязь часоў – беларускі ручнік.– Мінск: Беларусь, 2002.

13. Казакова, І. В. Беларускі фальклор: вучэбны дапаможнік/ І. В.Казакова. — Мінск: выдав. Цэнтр БДУ, 2007. — С.10-25

13. Кайсаров А., Глинка Г., Рыбаков Б. Мифы древних славян.

**14.** Лак, Э. Славянская мифология: энциклопедический словарь / Э. Лак. — М.: Наука, 1997. — С.4.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЛІТАРАТУРА ПА КУРСУ. ДАДАТКОВАЯ.


1. Малашук, І. М. Архетып сонца ў беларускім фальклоры / І.М.Малашук — Мінск: Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы
НАН Беларусі, 2003, — С.10-14

2. Мифология. Энциклопедия, – М.: Белфакс, 2002.

3. Мифы народов мира. Мифологическая энциклопедия в двух томах // Под ред. С.А. Токарева. – М, 1980.

4. Пашкоў, Г. П. Беларускі фальклор: Энцыклапедыя. Т. 2 /Г. П. Пашкоў. — Мінск: БелЭн, 2006. — 832 с.

5. Рыбаков Б. А. Язычество Древней Руси. – М., 1997.

6. Рыбаков Б. А. Язычество древних славян. – М., 1997.

7. Санько С. Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўнік / С.Санько, І. Клімовіч. — Мінск: Беларусь, 2006. — 599 с.

7. Сахута Я. М. Беларускае народнае мастацтва: Альбом. – Мн.: Беларусь, 1980.- 155 с.

8. Сахута Я. М. Народныя мастацкія рамёствы Беларусі. / Я. М. Сахута. – Мінск: Беларусь, 2001. – 167 с.

9. Славянская мифология. Словарь – справочник / Сост. Л.М. Вагурина, 1998. – 320 с.

10. Ткацтва: Зб. матэрыялаў па беларускаму народнаму ткацтву. /Беларус. ін-т праблем культуры; Уклад. В.А. Лабачэўская. – Мінск: , 1999.

11. Топорков, А. Л. Солнце: славянская мифология / А. Л. Топорков. — М.: Наука, 1995. — С. 361-363

12. Фадзеева В. Я. Беларускі ручнік. – Мінск: Полымя, 1994.

13. Шамак А. Міфалогія старажытнай Беларусі, 2004.-240 с.

14. Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. – Мінск: БелСЭ,


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# РЭЦЭНЗІЯ

**на вучэбную праграму па курсу " Тэхналогія рэстаўрацыі твораў ДПМ" (мастацкае ткацтва) па спецыяльнасці дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ( спецыялізацыя "Рэстаўрацыя твораў ДПМ") дацэнта кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва УА « Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў» А. І. Непачаловіч**

Змест прапанаванай праграмы ў поўнай меры падпарадкаваны галоўнай мэце дадзенага курса: сістэматызацыя і дапаўненне пачатковага ўзроўню ведаў студэнта ў галіне дэкаратыўна – прыкладнога мастацтва, авалоданне тэхнікай і тэхналогіяй апрацоўкі матэрыялаў, вывучэнне традыцыйных форм і відаў ДПМ, методык рэстаўрацыі, а таксама ўзбагачэнне іх новымі мастацка-вобразнымі, кампазіцыйнымі, тэхналагічнымі прыёмамі.

Праграма накіравана на выкананне наступных вучэбных задач:
-вывучэнне вытокаў і традыцый народнага мастацтва Беларусі;
-засваенне тэхнік і тэхналогій апрацоўкі матэрыяла;
-засваенне тэхналогій рэстаўрацыі і кансервацыі;
-выкананне эскізаў мастацка-вобразнага, пластычнага і кампазіцыйнага вырашэння;
- выкананне вучэбнай працы ў матэрыяле;
- самастойную працу студэнтаў.

Асноўны змест курса складаюць пытанні гісторыі развіцця мастацтва узорнага ткацтва Беларусі, традыцый народнай культуры, тэхнікі і тэхналогіі, а таксама практычныя навыкі выканання тканых вырабаў, якія разглядаюцца і вывучаюцца на працягу двух семестраў па спецыялізацыі "рэстаўрацыя і кансервацыя твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва".

Вучэбная праграма "Мастацкае ткацтва"распрацавана ў адпаведнасці з вучэбнымі рабочымі планамі і стандартамі вышэйшай школы для падрыхтоўкі прафесійных спецыялістаў па рэстаўрацыі твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Рэцензент
Намеснік старшыні
секцыі мастацкага тэкстыля
ГА "Беларускі саюз мастакоў" Н.У.Сухаверхава

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ